# ИСТОРИЯ

**С. Я. Новікаў**

## БАЯВАЯ ПАЎСЯДЗЁННАСЦЬ НА МАГІЛЁЎШЧЫНЕ 9–12 ЛІПЕНЯ 1941 г. (паводле журнала баявых дзеянняў 2-й танкавай групы Г. Гудэрыяна)

Отечественному читателю впервые представлены результаты исследования боевых действий 2-й танковой группы вермахта в ходе обеспечения стратегического прорыва через днепровский рубеж обороны на Могилевщине 9–12 июля 1941 г. Отмечается, что отражение танкового наступления силами 388-го стрелкового полка под командованием полковника С. Ф. Кутепова (172-й стрелковой дивизии) на Буйничском поле под Могилевом навсегда вошло в белорусскую историографию как одна из самых ярких страниц оборонительных сражений Красной армии на территории Беларуси летом 1941 г. Автор пытается реконструировать подневную картину боевых действий, ставя в центр научного поиска новые документальные источники и открывая малоизвестные страницы тех важных событий.

Паводле другога тома новага 12-томнага калектыўнага расійскага выдання "Великая Отечественная война 1941–1945 годов", "к 9 июля [1941 г. – *С.Н.*] танки Гудериана подошли к Могилеву" [1, с. 746]. Між тым узнікае пытанне, наколькі гэты навуковы тэзіс, якім у грамадскім дыскурсе замацоўваецца дакладны гістарычны факт і на многія гады выводзіцца з поля навуковай крытыкі па прычыне яго адлюстравання ў грунтоўнай працы, адпавядае рэдакцыйным указанням аб важнасці праўдзівага адлюстравання ваенных падзей. Пры гэтым мы цалкам падтрымліваем аўтараў выдання ў тым, што новую працу чытачы прымуць толькі ў тым выпадку, калі кожная старонка, кожны яе радок будуць праўдзівымі [2, с. 9].

Звернемся да журнала баявых дзеянняў нямецкага танкавага падраздзялення, якое ўдзельнічала ў баях на Буйніцкім полі пад Магілёвам у той "гарачы дзень" (К. М. Сіманаў), але не 9, а трыма днямі пазней, 12 ліпеня 1941 г. У беларускага чытача, добра знаёмага з баявымі падзеямі пад Магілёвам, адразу ўзнікаюць пытанні, напрыклад, аб тым, калі ж насамрэч "танкі Гудэрыяна падышлі да Магілёва", які з пачатку месяца рыхтаваўся да абароны і з цягам часу пераўтварыўся ў "крэпасць на Дняпры"; наколькі прыведзеная расійскімі аўтарамі гістарычная дата вынікае з дакументальных крыніц, у якой ступені карэлюе з імі і на што першапачаткова абапіраліся аўтары для пацвярджэння згаданай гістарычнай падзеі; ці можна казаць аб гістарычнай верагоднасці факта, калі ён не прайшоў адпаведную навуковую праверку ў працах прафесійных даследчыкаў, але зноў і зноў паўтараецца ў публікацыях рознага кшталту.

Аўтар гэтых радкоў спрабуе адказаць на гэтыя пытанні на аснове аналізу дакументальных крыніц процілеглага боку, у нашым выпадку нямецкіх, у першую чаргу – журнала баявых дзеянняў камандуючага 2-й танкавай групай

генерал-палкоўніка Г. Гудэрыяна, у якім у храналагічнай паслядоўнасці занатаваны не толькі ход баявых падзей і іх вынікі, але і прыведзены зыходныя дакументальныя матэрыялы (загады, данясенні, паведамленні, радыёграмы і г.д.), на падставе якіх складвалася карціна баявой паўсядзённасці. Нагадаем, што на той момант палявы штаб і назіральны камандны пункт камандуючага знаходзіліся ў Нова-Барысаве. У журнале адзначаецца, што ў тыя дні стаяла сухое летняе надвор’е.

Спачатку зазірнём у кругласутачныя запісы аб баявых падзеях 9.07.41 г., калі танкавая група цягам усяго дня праводзіла перагрупоўку і адваёўвала новыя плацдармы для падрыхтоўкі наступлення цераз Днепр і нанясення танкавага ўдару ў раён Смаленска.. Першы запіс быў зроблены ў 1.50 ночы і датычыўся тэлетайпнага загаду камандуючага 4-й танкавай арміі камандуючаму 2-й танкавай групы. У ім ставіцца задача перад 24-м танкавым корпусам, у склад якога ўваходзілі тры дывізіі, адпаведна адна механізаваная (10-я) і дзве танкавыя (3 і 4-я), аб захопе новага невялікага плацдарма ў раёне на паўночны ўсход ад Бабруйска пасля таго, як у ноч з 9 на 10 ліпеня 1941 г. часці 3-й танкавай дывізіі павінны быць заменены 1-й кавалерыйскай дывізіяй. Першачарговая задача для корпуса – захапіць плацдарм пад Магілёвам [3, Bl. 174]. Менавіта гэта згадка была адзіным упамінаннем назвы горада на васьмі старонках журнала баявых дзеянняў за 9 ліпеня.

Камандуючы 2-й танкавай групы разглядаў гэты дзень з улікам таго, што чым раней удасца нанесці ўдар па савецкіх умацаваннях на Дняпры, тым у значна меншай ступені гэта будзе садзейнічаць узмацненню праціўніка. У гэтай сувязі камандуючы бачыў важнасць неадкладнага прарыву дняпроўскага рубяжа ўмацаванняў на працягу 10–11 ліпеня 1941 г., для чаго патрэбна было правесці перагрупоўку сіл танкавай групы [4, Bl. 168].

Па стане на 6 гадзін раніцы 9.07.41 г. баявыя часці 2-й танкавай групы займалі наступныя пазіцыі.

24-ы танкавы корпус – камандны назіральны пункт знаходзіцца ў Чачэвіцах – завяршае баявыя дзеянні і вядзе перагрупоўку сіл дзеля нанясення ўдару на ўсход цераз Днепр. 1-я кавалерыйская дывізія ўводзіцца для аховы флангаў у трохкутніку Днепр – Бярэзіна – рог на паўднёвы ўсход аб Бабруйска; 3-я танкавая дывізія займае абарончыя пазіцыі паміж Жлобінам і Новым Быхавам; 4-я танкавая дывізія займае зыходныя пазіцыі ў раёне Старога Быхава; 10-я матарызаваная дывізія займае зыходныя пазіцыі на поўдзень ад Дашкаўкі, дзе ідуць нязначныя баі.

46-ы танкавы корпус – камандны назіральны пункт у Беразіно. Корпус, нягледзячы на тое, што праціўнік вядзе ўпартыя баі, якія скоўваюць агульны рух, паступова прасоўваецца наперад. Пры гэтым 10-я танкавая дывізія знаходзіцца на захад ад шашы Магілёў – Шклоў. Дывізія СС “Рэйх” з узмоцненым палком “Германія” яшчэ знаходзіцца на разбураным мосце цераз Друць на ўсход ад Закуплення, перадавы атрад палка – пад Досава (20 км на паўднёвы захад ад Магілёва). Асноўныя сілы дывізіі на маршы ў раён в. Эсьмоны (24 км на захад ад Бялыніч). Пяхотны полк “Вялікая Германія” рухаецца маршам да Беразіно.

47-ы танкавы корпус – камандны назіральны пункт у Крупках. Корпус паведамляе аб контрударах праціўніка, узмоцненых танкавымі падраздзяленнямі (каля трох дывізій), што прыводзіць да танкавых сутычак, якія завяршаюцца вялікімі стратамі для праціўніка. Пры гэтым 18-я танкавая дывізія пасля адбіцця моцнага контрудару знаходзіцца ў наступленні на праціўніка, які ўпарта абараняецца. Перадавыя часці дывізіі дасягнулі раёна за 7 км на захад і за 5 км на поўнач ад Коханава; 17-я танкавая дывізія знаходзіцца ў раёне Сянно – Ліпавічы (за 17 км на паўднёвы захад ад Сянно), узаемадзеянне паміж часцямі ў раёне Сянно і Ліпавіч застаецца пад пытаннем. У ноч дывізія павінна ўдарыць у напрамку на Коханава для таго, каб далучыцца да 18-й танкавай дывізіі; 12-я танкавая дывізія (3-я танкавая група) знаходзіцца на маршы з поўначы на Чарэю для таго, каб праясніць сітуацыю і заняць Сянно; 29-я пяхотная дывізія падыходзіць да Начы. Ударная група Штрайха збіраецца вакол Начы. Ударная група Узінгера заняла пазіцыю ў раёне на ўсход ад Барысава.

Такім чынам, па стане на 9 ліпеня ні адно з танкавых падраздзяленняў 2-й танкавай групы не наблізілася непасрэдна да Магілёва, інакш кажучы, нямецкія танкавыя падраздзяленні яшчэ не пагражалі пазіцыям, якія ў адпаведнасці з загадам № 1, аддадзеным камандзірам дывізіі генерал-маёрам М. Ц. Раманавым толькі вечарам 7 ліпеня 1941 г., займала 172-я стралковая дывізія. Гэта значыць, што не раней раніцы наступнага дня, 8 ліпеня, загад пачалі выконваць з улікам пастаўленых баявых задач па стварэнні непрыступнай абароны дняпроўскага рубяжа пад Магілёвам. Таму магчымае з'яўленне нямецкіх танкаў на пазіцыях 3-га батальёна 388-га стралковага палка на 3 дні раней за 12 ліпеня наўрад ці скончылася б так паспяхова для абаронцаў, якія толькі распачалі займаць баявыя пазіцыі, рыхтуючы іх да абароны.

Аналізуючы падзеі гэтага дня, звернем увагу на планы камандавання 2-й танкавай групы на 9.07.41 г., якія палягалі ў тым, каб 1) правесці перагрупоўку 24-га танкавага корпуса; 2) 46-аму і 47-аму танкавым карпусам заняць раён зыходных пазіцый і забяспечыць сувязь з 3-й танкавай групай [4, Bl. 166–167]. Такім чынам, з журнала баявых дзеянняў бачна, што камандуючы не ставіў задач па падрыхтоўцы наступлення ці прарыву на ўсход праз Магілёў, не кажучы аб штурме ўмацаванага плацдарма на Дняпры.

Між тым паспрабуем знайсці ў згаданым журнале адказ на пастаўленае вышэй пытанне аб дакладнай гістарычнай даце выхаду танкавых падраздзяленняў 2-й танкавай групы да Магілёва. Насамрэч, калі нямецкія танкі падышлі да ўмацаванага плацдарма і калі мелі месца баі з перадавымі танкавымі часцямі непасрэдна пад горадам на Дняпры? Звернемся да наступных запісаў ад 10, 11 і 12 ліпеня 1941 г.

Плануючы працяг наступлення на ўсход з мэтай прарыву рубяжа савецкіх умацаванняў пад Магілёвам, які германскія стратэгі называлі "Лініяй Сталіна", камандуючы аддае пэўныя распараджэнні адносна баявых задач на 10 ліпеня 1941 г.

Так, для 24-га танкавага корпуса баявыя задачы заключаліся ў тым, каб у другой палове дня (у 16.00) пачаць наступленне сіламі 4-й танкавай і 10-й матарызаванай дывізій з мэтай выхаду пад Стары Быхаў і на поўнач ад яго. Для 3-й танкавай дывізіі ноч з 9 на 10 ліпеня павінна азначаць пачатак вываду яе падраздзяленняў у раён на паўночны ўсход ад Бабруйска і замены 1-й кавалерыйскай дывізіяй з мэтай сабраць танкавыя сілы для далейшага пераходу цераз Днепр адразу ж за першым баявым эшалонам. Пасля паспяховага пераходу і стварэння невялікага ўмацавання асноўная задача для корпуса – узяцце з поўдня магілёўскага абарончага плацдарма. Корпус блакіруе раён на паўднёвы ўсход ад Старога Бахава ў напрамку на поўдзень, займае сваімі сіламі праз Гразівец і Чавусы шашу Рагачоў – Масква і накіроўвае ўдар праз Раслаўль на Калугу. Пры гэтым корпус забяспечвае ахову паўднёвага фланга групы, якая наступае на ўсход.

Як вынікае з дакумента, выкананне пастаўленых задач перад 24-ым танкавым корпусам узнімала неадкладнае пытанне аб забеспячэнні боезапасамі. Аднак камандуючы 2-й танкавай групай у тэлефоннай размове пацвердзіў абавязковы характар выканання пастаўленых задач нягледзячы на недахоп асобных боезапасаў, асабліва для цяжкіх палявых гаўбіц.

Для 46-га і 47-га танкавых карпусоў датай наступлення вызначана 11 ліпеня 1941 г. Пры гэтым 46-ы корпус забяспечвае пераход цераз Днепр непасрэдна на поўдні ад Шклова і наступае ў далейшым ва ўсходнім напрамку праз Расну і Горкі ў раён Ельні. 47-ы копрус збірае ўсе наяўныя сілы ў раёне Копысі і пасля захопу плацдарма вядзе наступленне на паўночны ўсход у напрамку Лядаў, пры гэтым займае плацдарм на ўсход ад Оршы. Потым корпус дасягае Смаленска, пераходзячы Днепр з абодвух бакоў ад горада, і наступае ў раён Дарагабужа. Для аховы левага фланга неабходна выкарыстаць баявыя групы Штрайха і Узінгера (займаюць усе масты на дарозе Талачын – Галаўчын да перакрыжавання на поўдні Круглага). Пры гэтым група Штрайха можа быць адначасова выкарыстана для нанясення ўдару на шашу на поўнач ад Оршы [5, Bl. 174–175].

На наступны дзень, 10 ліпеня, камандаванне 2-й танкавай групы мела планы наступлення цераз Днепр пад Старым Быхавам і заняцця раёна для падрыхтоўкі ўдару паміж Магілёвам і Оршай. Меркавалася пачаць наступленне на поўнач ад Старога Бахава 24-м танкавым корпусам у 5.00 пры ўзмоцненай падтрымцы авіяцыяй. 46 і 47-ы танкавыя карпусы займаюць плацдарм для наступлення, якое запланавана на раніцу 11.07.41 г. [5, Bl. 178].

З запісаў на 23.00 вечара аб падзеях, якія адбыліся на лініі наступлення 2-й танкавай групы 10 ліпеня, складваецца наступная карціна.

24-ы танкавы корпус захапіў плацдарм за ракой Днепр. Пры гэтым ліквідавана ўпартае супраціўленне праціўніка ў лясным масіве на ўсходнім беразе. Падцягванне новых сіл праціўніка не выяўлена. Ідуць баі за масты каля Строга Быхава і Баркулабава. Камандны назіральны пункт корпуса застаецца без змяненняў. 1-я кавалерыйская дывізія забяспечвае ахову ў раёне паміж Бярэзінай і Дняпром і паабапал Рагачова; 3-я танкавая дывізія з раёна на захад ад Старога Быхава выступае раніцай 11 ліпеня ў напрамку Магілёва; 4-я танкавая дывізія займае плацдарм у раёне в. Следзюкі; 10-я матарызаваная дывізія займае плацдарм ў раёне Лыкаўкі.

Назіральны камандны пункт 46-га танкавага корпуса знаходзіцца ў Галоўчыне. 10-я танкавая дывізія з падпарадкаваным ёй пяхотным палком "Вялікая Германія" займае лінію гатоўнасці на поўдзень ад Шклова; дывізія СС "Рэйх" на захадзе ад Шклова разам з палком СС "Германія" пакуль знаходзіцца за 12 км на захад ад Магілёва.

Назіральны камандны пункт 47-га танкавага корпуса знаходзіцца ў Галошава. 29-я матарызаваная дывізія займае зыходныя пазіцыі на паўднёвым усходзе ад Копысі; асноўныя сілы 18-й танкавай дывізіі займаюць зыходныя пазіцыі на паўночным захадзе ад Копысі; 17-я танкавая дывізія далучылася да корпуса толькі перад абедам пасля баёў пад Нямойтай і Абольцамі і захапіла апоўдні зыходную лінію. Дывізія перайшла шашу Шклоў – Орша каля 20.00.

Баявая група Штрайха праводзіць замену 18-й танкавай дывізіі і арганізуе ахову ўчастка ракі за 9 км на ўсход ад Коханава і на поўнач да Рапакоў фронтам на ўсход, па лініі Рапакоў – Алёнавічы (10 км на захад ад Коханава) фронтам на поўнач. Баявая група Узінгера падпарадкавана групе Штрайха і забяспечвае ахову пад Абольцамі.

План камандавання 2-й танкавай групы на 11.07.41 г. заключаецца ў тым, каб 24-ы танкавы корпус пашырыў захоплены плацдарм, а 46 і 47-ы танкавыя карпусы пачалі а 5-й гадзіне раніцы наступленне цераз Днепр пры падтрымцы 2 і 8-га паветраных карпусоў.

У канцы запісаў за гэты дзень прыведзена вытрымка з данясення камандавання групы армій "Цэнтр": "На аснове наяўных дакументаў (тэлефоннае паведамленне камандавання 4-й танкавай арміі ад 10.07.41 г.) канстатуецца, што 24-ы танкавы корпус стаў першым злучэннем, якое ў гэты дзень перайшло Днепр каля Старога Быхава ў ходзе наступлення, праведзенага 10.07.41 па ўсім фронце групай армій "Цэнтр" [5, Bl. 188–189].

Такім чынам, аналіз прыведзеных дакументальных фактаў з журнала баявых дзеянняў 2-й танкавай групы за 10.07.41 г. не ўтрымлівае доказаў на карысць таго, што ў гэты дзень танкі хоць якога-небудзь нямецкага злучэння ці баявой групы падышлі да Магілёва. Больш таго, відавочна, што баявыя дзеянні танкавых падраздзяленняў непасрэдна на лініі ўмацаванняў магілёўскага плацдарма да таго часу не мелі месца. Менавіта пра гэта сведчаць пакінутыя дакументальныя запісы часцей, якія ўваходзілі ў склад групы.

Адлюстраванне баявых падзей за 11.07.41 г. дае падставы выявіць тыя дакументальныя факты, якія сведчаць аб пастаянных баях часцей 2-й танкавай групы і Чырвонай арміі на плацдарме паміж Старым Быхавам і Магілёвам. У гэты ж час ладзіўся прарыў цераз дняпроўскія ўмацаванні паабапал Шклова. Становішча 24-га танкавага корпуса на 6.30 раніцы: 3-я танкавая дывізія затрымлівалася для выступлення сваімі часцямі ў напрамку на Магілёў па прычыне разбурэння моста цераз Лахву. Узвядзенне часовага моста будзе завершана толькі апоўдні. У гэты ж час 4-я танкавая дывізія забяспечвала пераход сваіх часцей цераз Днепр. Плацдарм мог быць пашыраны да Перакладавіч. 10-я матарызаваная дывізія пачынае фарсіраваць раку, але з самага пачатку прыходзіцца адбіваць атакі праціўніка каля Сцідорычаў.

46-ы танкавы корпус займае наступныя пазіцыі: 10-я танкавая дывізія з падпарадкаваным пяхотным палком “Вялікая Германія” перайшла ў 5.35 асобнымі часцямі цераз Днепр і была ў 5.55 за 1 км на ўсход ад ракі. Дывізія СС “Рэйх” на маршы з занятай вышыні 215 (5 км на паўднёвы захад ад Шклова) у напрамку Дняпра.

47-ы танкавы корпус на наступных пазіцыях: 29-я матарызаваная дывізія заняла плацдарм на ўсход ад Слабодкі (8 км на поўнач ад Шклова) і ўзяла Копысь. 17-я танкавая дывізія пачала наступленне а 6-й гадзіне раніцы. Баявая група Штрайха заняла Смаляны. У ходзе наступлення 46-га і 47-га танкавых карпусоў былі акружаны шматлікія групы праціўніка [6, Bl. 192–193].

Аб зменах, якія адбыліся ў баявых падраздзяленнях 2-й танкавай групы на працягу дня, сведчыць запіс у журнала баявых дзеянняў у 23.15. Адзначалася, што наступленне групы дазволіла выявіць слабыя месцы ў лініі абароны праціўніка. Кожны з трох танкавых карпусоў стварыў для сябе неабходны плацдарм. Пры гэтым праціўнік упарта трымаецца ў сваіх галоўных вузлах абароны – Магілёве і Оршы. На ўдарных пазіцыях лінія фронту праціўніка была прарваная. Ажыўлены рух на дарогах і шашы за лініяй фронту дае падставу для высновы аб тым, што такім чынам праціўнік разлічвае яшчэ на невялікі час працягваць абарону лініі ўмацаванняў на Дняпры.

Камандны назіральны пункт 24-га танкавага корпуса знаходзіцца ў в. Глухі (20 км на паўночны захад ад Старога Быхава). 4-я танкавая і 10-я матарызаваная дывізіі займаюць плацдарм па лініі Стары Быхаў – Перакладавічы – Слабодка – Лыкаўка. Падраздзяленні 4-й танкавай дывізіі знаходзяцца на маршы на Добуш (23 км на ўсход ад Старога Быхава). 3-я танкавая дывізія знаходзіцца на шашы Бабруйск – Магілёў (20 км на паўднёвы захад ад Магілёва).

Камандны назіральны пункт 46-га танкавага корпуса знаходзіцца ў Барышкавічах (10 км на паўднёвы захад ад Шклова). Пры гэтым 10-я матарызаваная дывізія з падпарадкаваным пяхотным палком “Вялікая Германія” перайшлі шашу Магілёў – Орша на ўсход ад Крывілеў (8 км на паўднёвы ўсход ад Шклова). Дывізія СС “Рэйх” вядзе наступленне на Порынкі (3 км на ўсход ад Шклова). Дывізія СС “Германія” забяспечвае ахову ў раёне в. Княжыцы ў напрамку Магілёва.

Камандны назіральны пункт 47-га танкавага корпуса знаходзіцца ў в. Галошава (6 км на паўднёвы ўсход ад Коханава). 29-я матарызаваная дывізія перайшла з усходу паабапал перакрыжавання дарогі (10 км на ўсход ад Копысі) Магілёў – Орша; перадавое падраздзяленне накіравана праз Барздоўку (17 км на паўднёвы ўсход ад Оршы) на Горкі; 17-я танкавая дывізія займае лінію ад завароту Дняпра (8 км на поўдзень ад Оршы – Чарвякова – Талашоўкі); 18-я танкавая дывізія знаходзіцца ў раёне Панізоўя ў распараджэнні камандавання корпуса. Баявая група Штрайха забяспечвае ахову лініі Талашоўка – Смаляны – Абольцы (выключаючы апошні). Падпарадкаваная яму група Узінгера забяспечвае ахову Абольцаў. У распараджэнні корпуса знаходзяцца масты пад Старым Быхавам, Баркулабавам, каля Копысі. 329-ы батальён знішчальнікаў танкаў на працягу дня ліквідаваў 51 танк праціўніка і 57 гружаных аўтамабіляў і цягачоў [6, Bl. 197–198].

З гэтага вынікае, што і 11.07.41 г. танкавыя падраздзяленні пакуль не падышлі да самога Магілёва. Такі гістарычны тэзіс пацвярджаюць скрупулёзныя літаральна пагадзінныя запісы ў журнале баявых дзеянняў, кожнае з якіх фіксавалася з улікам дакладнага часу, маштабаў падзеі і яе вынікаў. Аднак запісы, якія тычацца перыяду з 9 па 11 ліпеня, не далі вынікаў адносна выяўлення факта знаходжання танкавых сіл непасрэдна на лініі абароны Магілёва. Такі факт мы ў рэшце рэшт знаходзім, але толькі ў журнале баявых дзеянняў 2-й танкавай групы за 12 ліпеня 1941 г. Паводле паведамлення, якое ў 6.00 паступіла ў штаб камандавання групы ад аднаго з рухомых падраздзяленняў корпуса, "3-я танкавая дывізія вядзе бай з ворагам на заходнім беразе Дняпра на паўднёвым захадзе ад Магілёва" [7, Bl. 202].

Звернем увагу чытача на гэты дакументальны запіс для таго, каб вызначыць, што насамрэч хаваецца за адным лаканічным радком дакумента, пакінутым у журнале баявых дзеянняў 2-й танкавай групы. З прамежкавага паведамлення, якое патрапіла ў штабны аддзел групы ў 16.45, вынікае, што на працягу дня адбыліся падзеі, якія прывялі да таго, што камандаванне 24-га танкавага корпуса аддае камандзіру 3-й танкавай дывізіі загад пакінуць поле бою пад Магілёвам (паводле запісаў, пад Буйнічамі за 4 км на паўднёвы захад ад Магілёва), перадаць ахову гэтага рубяжа 1-й кавалерыйскай дывізіі, а танкавыя падраздзяленні вывесці ў напрамку на Стары Быхаў, дзе неабходна правесці пераправу цераз Днепр, паколькі дывізіі ставіліся задачы па ўдзеле ў наступленні 24-га корпуса на праціўніка, які знаходзіўся ў раёне Магілёва – Чавусаў – Роснаў. Гэты ўдар наносілі адпаведна: справа – 4-я танкавая дывізія, у цэнтры – 10-я танкавая дывізія, злева – 3-я танкавая дывізія [7, Bl. 206]. З гэтага вынікае, што танкавыя часці пакідалі баявыя пазіцыі пад Магілёвам, здымаліся з гэтага напрамку вядзення баявых дзеянняў для выкарыстання на новым участку наступлення 24-га танкавага корпуса. Баявыя задачы па захопе ўмацаванага плацдарма і горада Магілёва заставаліся не вырашанымі на той момант, іх пакідалі пяхотным часцям, якія адставалі ад рухомых танкавых часцей 2-й танкавай групы.

Між тым зварот да журнала баявых дзеянняў гэтай групы не дае дакладнага адказу на пытанне аб тым, што адбылося непасрэдна ў час бою, чым ён завяршыўся для 3-й танкавай дывізіі, якая, паводле ранішняга паведамлення, "вяла бай з ворагам на заходнім беразе Дняпра на паўднёвым захадзе ад Магілёва". Каб даведацца аб гэтым, неабходна звярнуцца да іншых дакументаў, у нашым выпадку – данясення 6-га палка гэтай дывізіі, які 12 ліпеня 1941 г. сіламі аднаго танкавага батальёна вёў баявыя дзеянні ў ходзе нанясення ўдару ў напрамку на Магілёў, аднак не толькі на Буйніцкім полі [8, с. 14–19].

З дакумента відаць, што ў ходзе наступлення трох нямецкіх танкавых рот (5, 7 і 8-й) самым складаным з'яўляўся ўчастак баявых дзеянняў не пад в. Буйнічы, якая размяшчалася на адкрытай мясцовасці, а ў раёне лясной в. Туманаўка (паміж чыгункамі на Гомель і Асіповічы). Калі 8-я танкавая рота, якая дзейнічала ў цэнтры наступаючых падраздзяленняў, у асноўным выканала баявую задачу і заняла ўчастак паміж Бабруйскай шашой і чыгункай на Гомель, пры гэтым узяла ў палон 80 чырвонаармейцаў, то на лініі наступлення 5-й танкавай роты пад Туманаўкай савецкія артылерысты, танкісты, а таксама сапёры, якія ўмела паставілі міннае поле, падарвалі і зніш-

чылі ўсе баявыя машыны 2 і 4-га танкавых узводаў роты (паводле штатнага ўліку на ўзбраенні ў “лёгкай” танкавай роце знаходзіліся 22 танкі, з якіх 5 танкаў Т–II і 17 баявых машын Т–III) [8, с. 18–19].

У рапартах камандзіраў танкавых рот зафіксаваны важныя звесткі пра разгортванне баявых дзеянняў на кожным са згаданых участкаў, адлюстравана ступень баявой гатоўнасці абаронцаў горада на Дняпры, найперш часцей Чырвонай арміі, якія праявілі сваё тактычнае ўменне і практычныя навыкі баявых дзеянняў у час арганізацыі абароны дняпроўскага рубяжа пад Магілёвам. Паводле гэтых дакументальных крыніц, на лініі наступлення 3-й танкавай дывізіі непасрэдна ў раёне в. Буйнічы нямецкія танкісты сустрэлі эфектыўную агнявую абарону савецкіх артылерыстаў, танкістаў і пяхоты, а таксама сапёрных падраздзяленняў.

Такім чынам, кожны факт баявой паўсядзённасці на тэрыторыі Беларусі летам 1941 года патрабуе навуковай верыфікацыі, праверкі з выкарыстаннем прамых і ўскосных дакументальных крыніц і толькі пасля гэтага ўвядзення ў шырокі навуковы ўжытак. На наш погляд, найбольш прыдатным для гэтай справы з’яўляецца метад кампаратыўнага аналізу дакументальных крыніц, які дае чытачу магчымасць выбару: або адысці ад аднабаковага погляду і, такім чынам, пазбегнуць ненавуковых ацэнак, або пайсці па шляху стварэння рэальнай карціны на аснове новых дакументальных крыніц.

## ЛІТАРАТУРА

1. Великая Отечественная война 1941–1945 годов : в 12 т. – М. : Кучково поле, 2012. – Т. 2: Происхождение и начало войны. – 1008 с.
2. Великая Отечественная война 1941–1945 годов: в 12 т. – М. : Воениздат, 2011. – Т. 1: Основные события войны. – 848 с.
3. Darstellung der Ereignisse am 9.07.1941. – BA-MA. RH 21-2/927. – Bl. 171–178.
4. Darstellung der Ereignisse am 8.07.1941. – BA-MA. RH 21-2/927. – Bl. 159–168.
5. Darstellung der Ereignisse am 10.07.1941. – BA-MA. RH 21-2/927. – Bl. 181–189.
6. Darstellung der Ereignisse am 11.07.1941. – BA-MA. RH 21-2/927. – Bl. 192–199.
7. Darstellung der Ereignisse am 12.07.1941. – BA-MA. RH 21-2/927. – Bl. 202–208.
8. Бой 2-га батальёна 6-га танкавага палка пад Магілёвам // Беларускі гістарычны часопіс. – 2007. – № 7. – С. 14–19.

*Поступила в редакцию 26.03.15*